14. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 9.
15. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 20.
16. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 25.
17. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 28.
18. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 29.
19. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 43.
20. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 47.
21. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 51.
22. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 254.
23. *Толкачев, Н. Т.* Из истории высшего библиотечного образования в БССР / Н. Т. Толкачев // Ученые записки / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1956. – Вып. 6. – С. 55-71.

***Друк Галіна Мацвееўна***

### ***«Час – гэта мы»*: да юбілею факультэта**

У артыкуле коратка пададзена гісторыя ўтварэння кафедры беларускай і замежнай філалогіі ў складзе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, зроблены агляд асноўных кірункаў яе дзейнасці.

*Ключавыя словы:* кафедра; адукацыя і выхаванне; навуковая дзейнасць; традыцыі; творчасць.

***Halina M. Druk***

### **«Time is Us»: the Faculty Anniversary**

The article provides a brief history of the creation of the Department of Belarusian and Foreign Philology as a part of the Faculty of Information and Document Communications, and gives a review of the main activities of the Department.

*Keywords:* Department; education and training; scientific activity; traditions; creativity.

*Пакліч – былое адгукнецца*
*Жалейкаю за хваінай;*
*Скраніся – і важкой хадой*
*Наступнае ў паход кранецца.*
*А. Куляшоў*

Кафедра беларускай і замежнай філалогіі – адно з гістарычна важных падраздзяленняў у структуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, лёс якога ў пэўнай ступені нагадвае чалавечы ці нават самой Беларусі. Свой шлях кафедра пачынала ў 1975 годзе як літаратурная і ідзе гэтым шляхам больш за 40 гадоў, атрымліваючы ў розныя перыяды новыя «імёны». Апошнімі істотнымі вехамі ў гісторыі кафедры былі 2006-ы і 2018-ы гады, калі яна перажывала аб'яднанне з іншымі структурнымі падраздзяленнямі, што былі самастойнымі таксама з 1975 года. Напрыклад, з кафедрай сусветнай літаратуры (якую ўзначальвала з 1993 па 2006 гады прафесар, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Н. А. Булацкая[27]) – тады атрымала назву

[27] Як загадчык кафедры Н. А. Булацкая ініцыявала перамены і садзейнічала новаму выкладанню літаратуры ў сувязі з пераходам на шматузроўневую ўніверсітэцкую сістэму навучання: у вучэбны працэс былі ўведзены спецкурсы і курсы па выбары (да прыкладу, у 1993г. іх было 5, а ў 1994г. – 10), дзяржаўны экзамен па сусветнай літаратуры на факультэце завочнага навучання, курс сусветнай літаратуры стаў выкладацца асобнымі часткамі як «Літаратура краін Заходняй Еўропы і Амерыкі (ад антычнасці па сучаснасць)» і «Славянскія літаратуры». Кафедра мела кантакты з амбасадамі Расіі, Японіі, запрашала выкладаць літаратуру знакамітых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры», і аб'яднанне з кафедрай замежнай мовы (загадчыкі кафедры: 1998–2006 гг. – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Н. А. Падабедава[28], з 2006 г. – кандыдат філалагічных навук, дацэнт М. І. Кускоў), у выніку чаго і ўзнікла сучасная яе назва.

По свайму статусу кафедра з'яўляецца агульнаўніверсітэцкай, але падначалена дэканату факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Больш за дзесяцігоддзе кафедра ажыццяўляла дзейнасць па падрыхтоўцы спецыялістаў з прысваеннем кваліфікацыі «Бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык беларускай мовы і літаратуры»; намаганнямі супрацоўнікаў забяспечвалася выкладанне каля 15 спецыяльных дысцыплін філалагічнага кірунку. На сучасным этапе члены кафедры выкладаюць беларускую, англійскую, французкую, нямецкую, іспанскую мовы, беларускую і сусветную літаратуры на ўсіх факультэтах універсітэта, а таксама некалькі дысцыплін па выбары студэнтаў. Нягледзячы на шэраг няпростых гістарычных перамен кафедра і сёння застаецца для студэнтаў і супрацоўнікаў, калег-выкладчыкаў своеасаблівым кансультатыўным цэнтрам па рэдакцыйна-выдавецкіх пытаннях, культуры мовы і беларускамоўнага справаводства.

Жыццядзейнасць кафедры ад вытокаў, выпрацоўка ўласных традыцый была магчымай дзякуючы яе загадчыкам – кандыдату філалагічных навук, дацэнту Н. Ф. Федзюковай, кандыдату філалагічных навук, дацэнту А. Ф. Майсеенку, прафесару, доктару філалагічных навук М. М. Грынчыку (узначальваў кафедру амаль 20 год) – і, зразумела, прафесійна падрыхтаванаму педагагічнаму калектыву. Плённа працавала на станоўчы імідж свайго падраздзялення і ў цэлым ВНУ прафесар, кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. А. Гуліцкая, якая разам з тым паспрыяла напаўненню кафедры маладымі перспектыўнымі выкладчыкамі. Пасля кафедру ўзначаліла доктар філалагічных навук, прафесар Г. К. Тычко; яе змяніла на гэтай пасадзе кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі А. М. Пісарэнка, з прыходам якой ажывілася па розных кірунках і дзейнасць кафедры, у прыватнасці навуковая і выхаваўчая праца, узмацнілася практыка творчага падыходу да навучання.

Пакінулі свой след у гісторыі кафедры такія выкладчыкі як В. С. Драбеня, Г. Р. Дуркіна, Э. В. Садаўнічы, Н. Л. Суддзева, М. С. Малчанава, В. В. Няфёдаў, Н. Р. Ільіна, Л. С. Савік, А. А. Жалуновіч, Р. І. Саматыя, Т. М. Гулева, Л. М. Дзіцэвіч, Н. В. Дзянісава, В. Ч. Гронская і інш., сумяшчальнікі – Я. А. Гараднiцкі, Л. Д. Сінькова, В. І. Козіч. Многія з названых прозвішчаў – добра вядомыя асобы ў Беларусі, яны з'яўляюцца аўтарытэтнымі ў філалагічнай сферы. Некаторыя выкладчыкі працуюць з часоў заснавання асобных структурных падраздзяленняў, што сфарміравалі сучасную кафедру беларускай і замежнай філалогіі (Н. А. Булацкая, Н. А. Падабедава, В. І. Баравік, Г. А. Харытончык (працуе з 1978 г.), В. С. Варапаева (працуе з 1980 г.)). Штат сучаснай кафедры беларускай і замежнай філалогіі складаецца з 21 выкладчыка, з якіх 1 – доктар навук, прафесар, 4 прафесары, 5 дацэнтаў, 10 старшых выкладчыкаў, 1 выкладчык. Па выніках маніторынгаў, што праводзіліся ў студэнцкім асяроддзі, усе выкладчыкі кафедры атрымліваюць станоўчую і высокую ацэнку, а Н. А. Булацкай, В. С. Варапаевай,

---

айчынных і замежных навукоўцаў, а выкладчыкаў кафедры запрашалі ў іншыя ВНУ Мінска, Гродна, нават Індыі. Літаратура выкладалася не толькі студэнтам усіх факультэтаў ВНУ, але і слухачам падрыхтоўчага аддзялення.

[28] Кафедра пад кіраўніцвам Н. А. Падабедавай наладзіла кантакты з замежнымі ўстановамі вышэйшай адукацыі, у прыватнасці, з Вестфальскім універсітэтам імені Вільгельма г.Мюнстэра. У выніку ў нашай ВНУ быў створаны першы камп'ютарны клас з праграмамі для навучання студэнтаў на 3 замежных мовах – англійскай, французскай, нямецкай. Супрацоўніцтва ажыццяўлялася таксама па лініі фонда Роберта Боша: напрыклад, дацэнт Г. А. Харытончык стажыравалася ў Мюнстэрскім універсітэце, прафесуру Гейдэльбергскага ўніверсітэта кафедра запрашала чытаць лекцыі студэнтам БДУКМ.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. А. Гуліцкай, Г. М. Друк, А. М. Пісарэнцы, В. В. Шунейцы неаднаразова прысвойвалася пэўная намінацыя з наступнага пераліку: «Выкладчык года», «Самы лепшы выкладчык», «Самы надзейны выкладчык», «Самы патрабавальны выкладчык». Напэўна, адна з моцных традыцый кафедры, дзякуючы якой забяспечваецца і станоўчы маральна-псіхалагічны клімат, і нармальны ўзровень працы – арганічнае спалучэнне педагагічнага вопыту, творчых набыткаў старэйшых супрацоўнікаў і таленту маладзейшых кадраў.

*У акіяне слова –*
*ані мяжы, ні донца.*
*Ёсць там адна аснова:*
*праца*
*і праца бясконца!..*
*В. Жуковіч*

Навукова-даследчая дзейнасць – адзін з кірункаў, у якім мэтанакіравана развіваецца кафедра беларускай і замежнай філалогіі. Нельга не згадаць, што пры кафедры створаны Праблемны савет па філалагічных навуках, зместам працы якога з'яўляецца экспертыза, апаніраванне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый гуманітарнага профілю. У яго складзе сёння 8 кваліфікаваных спецыялістаў, з якіх 5 – выкладчыкі кафедры (Н. А. Булацкая – старшыня навуковага савета ад моманту яго стварэння, В. С. Варапаева, Г. М. Друк, І. П. Клімаў, А. М. Пісарэнка, С. М. Тычына). Па выніках работы савета толькі за апошнія 5 год рэкамендавана да абароны 1 доктарская і 7 кандыдацкіх дысертацый, якія затым былі паспяхова абаронены іх кандыдатамі і зацверджаны ВАК.

Кафедра беларускай і замежнай філалогіі можа ганарыцца выбітнымі навукоўцамі, якія ў пэўны гістарычны перыяд тут працавалі. Гэта найперш М. М. Грынчык – аўтар шэрагу манаграфій, сааўтар падручнікаў «Гісторыя беларускай літаратуры», Л. С. Савік – даследчык лёсу і творчасці рэпрэсаваных аўтараў, пісьменнікаў-эмігрантаў і аўтар сотняў энцыклапедычных артыкулаў, шэрагу нарысаў, літаратурных партрэтаў, Г. К. Тычко – аўтар артыкулаў, рэцэнзій, манаграфій, падручнікаў па гісторыі развіцця беларускай літаратуры (да прыкладу, перыяд працы ў БДУКМ абазначаны з'яўленнем кнігі «Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў: Час і асобы»), В. А. Гуліцкая – спецыяліст па тэорыі і практыцы сучаснай беларускай мовы, аўтар вучэбнага дапаможніка «Уводзіны ў мовазнаўства» і дзесяткаў артыкулаў, сааўтар шэрагу дапаможнікаў.

Кафедра стабільна выконвае даследаванні ў рэчышчы фундаментальных навуковых тэм, цесна звязаных з надзённымі праблемамі філалогіі і практычнымі задачамі вучэбнага працэсу на пэўным гістарычным этапе. Вынікамі гэтай працы з'яўляюцца ўдзел у міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, сотні апублікаваных артыкулаў, грунтоўныя вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі (Н. А. Булацкая «Гісторыя рускай літаратуры XIX ст. ў схемах і каментарыях», «Славянскія літаратуры: класіка і сучаснасць (балгарская, польская, сербская, чэшская)»; І. П. Клімаў «Старажытная беларуская літаратура XI–XVI стст. Эпохі і постаці»; А. М. Пісарэнка «Філалагічны аналіз мастацкага тэксту» і інш.; В. А. Гуліцкая і А. М. Пісарэнка «Лінгвастылістычны аналіз мастацкага тэксту» і «Культура мовы»; В. А. Гуліцкая, А. М. Пісарэнка, В. В. Шунейка – аўтары дапаможніка «Беларуская мова: спецыяльная лексіка»; Т. П. Біруля і С. Г. Бязмен – аўтары дапаможніка па англійскай мове «Studying Culture»; калектывам усіх выкладчыкаў замежных моваў падрыхтаваны падручнік для самастойнай работы студэнтаў «British Culture in Brief»), манаграфіі (Г. М. Друк «У храме Слова: Міфатворчасць Віктара Казько»; А. М. Пісарэнка «Дэрывацыя і функцыя экспрэсіўных прыметнікаў у мове народна-паэтычных твораў», С. М. Тычына «Сны і снабачанні Яна Баршчэўскага», інш.). Асобна варта адзначыць навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадычную дзейнасць В. С. Варапаевай, якая з'яўляецца вядомым у рэспубліцы аўтарам падручнікаў і метадычных дапаможнікаў (толькі за апошнія 7 гадоў надрукавана звыш 100 работ, з іх 44 падручнікі, 14 метадычных дапаможнікаў), бярэ ўдзел згодна з загадам Міністэрства адукацыі ў распрацоўцы метадычных комплексаў новага пакалення для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (падручнікі, метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў і вучняў).

Кафедра падтрымлівае супрацоўніцтва на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях – гэта праца ў складзе камісій па атэстацыі ВНУ ці ДЭК, рэцэнзаванне падручнікаў, манаграфій, магістарскіх дысертацый, вучэбна-метадычных комплексаў, вучэбных праграм, артыкулаў, удзел у канферэнцыях па-за межамі Рэспублікі Беларусь, апублікаванне матэрыялаў у замежных крыніцах, правядзенне мерапрыемстваў у замежных інфармацыйных цэнтрах, сувязь з адпаведнымі службамі пасольстваў замежных краін, інш. Напрыклад, С. М. Тычына і І. П. Клімаў у складзе ГА Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, І. П. Клімаў – член Міжнароднай камісіі па біблейных перакладах пры Міжнародным камітэце славістаў.

Адно з адгалінаванняў сістэмнай навуковай дзейнасці кафедры – арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў і кіраўніцтва ёю. Раней, калі кафедра курыравала беларускую спецыялізацыю, работы студэнтаў ФІДК, выкананыя пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры, неаднаразова атрымлівалі па выніках рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх работ прызавыя месцы. Сёння пераважаюць іншыя формы работы са студэнтамі. Напрыклад, традыцыйна звыш 60 студэнтаў у сярэднім з розных факультэтаў і курсаў прымае ўдзел у штогадовай выніковай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, якая праводзіцца ў БДУКМ. Асабліва актыўнае супрацоўніцтва са студэнтамі ў гэтай форме падтрымліваюць выкладчыкі замежных моваў.

Кафедра беларускай і замежнай філалогіі сістэматычна і своечасова ажыццяўляе падрыхтоўку вучэбна-метадычных матэрыялаў, неабходных для забеспячэння працэсу адукацыі – вучэбных праграм, вучэбна-метадычных комплексаў і, як вышэй адзначалася, вучэбных дапаможнікаў. Выкладчыкі кафедры ўкараняюць інавацыйныя камп'ютарныя, педагагічныя тэхналогіі, падтрымліваюць цесныя кантакты з бібліятэкай, праводзячы сумесна з ёю актыўную работу па забеспячэнні студэнтаў сучаснымі падручнікамі, перыядычнымі выданнямі на беларускай, англійскай, нямецкай і французскай мовах. Створана электронная бібліятэка па замежных мовах, якая мае звыш 1000 найменняў электронных кніг, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, артыкулаў, слоўнікаў і г. д. Такім чынам, навукова-даследчая работа кафедры – адзін з асноўных паказчыкаў якасці, прафесіяналізму ўсёй вучэбна-метадычнай работы.

*Клопат усялякага слова –*
*знайсці найкарацейшы шлях да*
*суразмоўніка, слухача, чытача*
*М. Стральцоў*

Выхаваўчая і творчая дзейнасць – асаблівы кірунак кафедры беларускай і замежнай філалогіі; гэта ў пэўнай ступені яе душа, бо мова і літаратура – профільныя дысцыпліны гэтай кафедры. Таму дзейнасць у дадзеным кірунку ажыццяўляецца на ўсіх занятках і кожным выкладчыкам – праз слова, тэкст, кнігу[29]. У выкладанні вучэбных курсаў

[29] Нельга не адзначыць, што ў апошнія гады колькасць гадзін на выкладанне дысцыплін кафедры істотна скарацілася, што, зразумела, не вельмі спрыяе належнаму выкананню адной з найважнейшых задач літаратурнай і, шырэй, філалагічнай адукацыі ў ВНУ – духоўна-гуманістычнаму развіццю і выхаванню моладзі. Творцы і іх мастацкія творы засцерагаюць і актыўна супрацьстаяць той з'яве, якую яшчэ В. Цяпінскі ў сваёй «Прадмове» да Евангелля назваў «аплаканым невуцтвам» і якая, на жаль, набывае ўсё больш выразныя і зусім несімпатычныя рысы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыялісты праяўляюць крэатыўнасць, імкнучыся ўкараняць нетрадыцыйныя формы правядзення семінарскіх заняткаў (Н. А. Булацкая, С. М. Тычына, А. М. Пісарэнка і інш.), кантралюемай самастойнай работы (напрыклад, студэнтамі I курса ФІДК была падрыхтавана пастаноўка спектакля па п'есе-казцы П. Васючэнкі «Страшнік Гам» (2016 г., куратар праекта – Г. М. Друк)) ці залікаў (у форме круглага стала правяла А. М. Пісарэнка ў 2018/2019 н. г., літаратурна-музычнай кампазіцыі – В. С. Варапаева па аўтарскім курсе), прытрымліваюцца практычна-арыентаванага навучання.

Выхаваўчая работа кафедры ажыццяўляецца па-за межамі вучэбнага працэсу – гэта тэматычныя літаратурна-музычныя вечары, мерапрыемствы «ТыДня роднай мовы», паэтычныя конкурсы, літаратурны турнір, фотаконкурсы, алімпіяды па англійскай мове і мн. інш. Кафедра ладзіць сустрэчы з пісьменнікамі Беларусі, удзел у іх бралі, у прыватнасці, А. Дудараў, А. Зэкаў, Л. Дранько-Майсюк, Л. Рублеўская, Г. Марчук, М. Шабовіч, Д. Пятровіч і інш.

Пры кафедры беларускай і замежнай філалогіі дзейнічае з кастрычніка 2001 года літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет» (арганізатары – А. М. Пісарэнка (паэтка, член СПБ Алена Багамолава) і старшы выкладчык Н. В. Дзянісава (літаратурны крытык, член СБП Н. Якавенка, былы супрацоўнік кафедры), у розныя гады да працы далучаліся старшы выкладчык В. В. Шунейка, дацэнт С. М. Тычына, дацэнт В. Ч. Гронская (цяпер працуе ў БДУ), апошнім часам – прафесар В. С. Варапаева). Намаганнямі літаб'яднання выдадзена 11 зборнікаў вершаў і прозы: «БУКет», «Акварэлі», «Завіруха кропель», «Каліва», «Кветка ў мегаполісе», «Дар зямны», «Веснiцы», «Світальныя словы», «Ляці вышэй!», «Вітаю цябе, Натхненне!», «Жыву». Творы «БУКетаўцаў» неаднаразова друкаваліся і друкуюцца ў газетах «ЛіМ», «Наша слова» і часопісах «Маладосць», «Літаратурны квартал», «Альфабэт», «Верасень», былі прадстаўлены на такіх рэспубліканскіх і міжнародных паэтычных конкурсах як «Фестываль аднаго верша», «Песня натхнення» і інш. Сябры аб'яднання «БУКет» актыўна ўдзельнічаюць у культурных мерапрыемствах універсітэта і па-за яго межамі (святкаваннях Дзён ФІДК, Дзён славянскай пісьменнасці і культуры ў Рэспубліцы Беларусь, інш.). Да юбілеяў класікаў беларускай літаратуры намаганнямі «БУКетаўцаў» рыхтаваліся тэатралізаваныя пастаноўкі («Быў. Ёсць. Буду.» па матывах аповесці «Ладдзя роспачы» і паэзіі У. Караткевіча, «Песня на сон у бяссонне» па творчасці Я. Купалы і Я. Коласа, «Слова – ўсяго аснова. Душа крылатая ў слова» па творчасці Р. Барадуліна і інш.) Акрамя таго, многія ўдзельнікі «БУКета» сталі членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі – А. Шостак, Я. Лайкоў, В. Гронская, В. Бялова, А. Свечнікава. На сённяшні дзень літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет» налічвае звыш 20 чалавек, сярод якіх студэнты ўсіх факультэтаў БДУКМ, выкладчыкі і супрацоўнікі ўніверсітэта.

Такім чынам, кафедра беларускай і замежнай філалогіі, нешта страчваючы-набываючы ў выніку складаных гістарычных перамен, працягвае жыць і цвёрда трымацца тых пазіцый, якія былі напрацаваны ўсімі папярэднімі дзесяцігоддзямі – культуры і творчасці, высокага прафесіяналізму, беларускасці. Застаецца пажадаць усім супрацоўнікам кафедры і надалей выконваць сваю пачэсную справу – адкрываць маладому пакаленню жыццё і родны край.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ